штатную единицу и работу библиотеки целесообразнее вести в автоматизированной форме. В ноябре 2017 г. была начата разработка программного средства для автоматизации библиотеки Verlibr. Инициатором и разработчиком выступила библиотекарь I категории В. С. Самусенко.

Программный продукт (ПП) Verlibr 1.0 имеет следующие подсистемы: фонд (добавление/удаление единиц фонда, а также научная обработка, с возможностью редактирования введенных записей); читатели (добавление, удаление читателей, изменение информации о читателях); словари авторов и тематического предмета; подсистема электронного каталога; подсистема статистики.

Данный ПП, Verlibr 1.0, разработан с использованием технологии WPF и системы управления базой данных (СУБД) Microsoft SQL Server Express. Программа позволяет вносить/удалять единицы фонда, информацию о читателях, данные словарей, а также редактировать введенные данные. Однако система предполагает только простой ввод данных единицы хранения, без связывания их в единое библиографическое описание (что в будущем планируется доработать).

В заключение необходимо отметить, что ПП Verlibr 1.0 планируется внедрить в деятельность библиотеки РЦНК.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## КУЛЬТУРНА-АДУКАЦЫЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ МУЗЕЯ СЯДЗІБНАГА ПОБЫТУ ЯК ФАКТАР МУЗЕЕФІКАЦЫІ ПАЎСЯДЗЁННАСЦІ МЯЖЫ XIX–XX стст.

***В. С. Сідаровіч,***
*навуковы супрацоўнік Музея гісторыі горада Мінска*

У калектыўнай свядомасці большай часткі жыхароў Беларусі ўстойліва ўкаранілася ўяўленне аб музеі як установе, якая займаецца выключна зборам і паказам музейных прадметаў. Дзякуючы намаганням музейных супрацоўнікаў такое стаўленне пастунова змяняецца і мы назіраем трансфармацыю «музея-збіральніка» ў «музей-інтэрпрэтатар». Асаблівае значэнне ў гэтым працэсе мае культурна-адукацыйная дзейнасць, пад якой разумеюць навучанне ў культурнай прасторы музея.

Культурна-адукацыйная дзейнасць з'яўляецца адным з асноўных накірункаў працы музея, тэарэтычным падмуркам якога ёсць музейная педагогіка [2]. У шырокім сэнсе пад культурна-адукацыйнай дзейнасцю разглядаюць сукупнасць мерапрыемстваў, накіраваных на пашырэнне інфармацыі, прадстаўленай праз музейныя прадметы, раскрыццё падтэксту экспазіцыі і кантэксту гістарычнай эпохі, якую ўвасабляе музей. Спецыялісты па музейнай педагогіцы вылучаюць некалькі мэтаў культурна-адукацыйнай дзейнасці. Асноўнай мэтай дзейнасці музея з'яўляецца інфармаванне, якое дасягаецца шляхам першаснага знаёмства з музейнай экспазіцыяй праз экскурсію. Навучанне разглядаецца як больш глыбокая ступень засваення інфармацыі. Яе сутнасць – у атрыманні больш глыбокіх і дэталёвых звестак аб музеі і артэфактах, якія ён адлюстроўвае, што адбываецца праз правядзенне майстар-класаў і музейных урокаў. Развіццё творчых здольнасцяў часам разглядаецца як найвышэйшая ступень паглыблення ў музейную інфармацыю шляхам актыўнага ўдзелу ў творчых студыях, конкурсах і г. д.

Адной з мэт выступае камунікацыя, фарміраванне якой у музеі можа разглядацца ў двух накірунках: як міжасабовая камунікацыя, прадстаўленая праз музейныя сустрэчы, вечары ўспамінаў, так і камунікацыя з музейнай інфармацыяй.

Адпачынак у музеі – тэндэнцыя апошніх дзесяцігоддзяў. У «грамадстве хуткасці» асабліва ўзрастае патрэба ў адпачынку шляхам далучэння да класічных каштоўнасцей, прадстаўленых у музейнай прасторы [3, с. 165]. Разам з тым у дадзеным рэчышчы не разглядаецца надзвычай важны аспект – выкарыстанне культурна-адукацыйных мерапрыемстваў у справе музеефікацыі паўсядзённасці.

У культуралогіі пад паўсядзённасцю разглядаюць сукупнасць матэрыяльнага і духоўнага атачэння чалавека, яго месца ў грамадстве і зносіны з іншымі людзьмі [1, с. 6; 4, с. 105]. Асабліва багатымі на праявы матэрыяльных і духоўных артэфактаў па праву лічацца былыя шляхецкія сядзібы, частка з якіх музеефікавана ў якасці асяродкаў сядзібнага побыту.

Для больш глыбокага разумення шляхоў распрацоўкі культурна-адукацыйнай дзейнасці ў музеях такога тыпу трэба звярнуцца да крыніц, якія даюць уяўленні аб паўсядзённасці жыхароў сядзіб мяжы XIX–XX стст.: мемуарнай літаратуры,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ліставання, эканамічных і гаспадарчых дакументаў. Такі блок крыніц дае яскравыя звесткі аб побыце людзей мяжы стагоддзяў і дапамагае ў справе стварэння плана мерапрыемстваў.

Асаблівую ўвагу ў дадзеным выпадку аўтар хацеў бы звярнуць на план культурна-адукацыйнай дзейнасці, распрацаваны для музея «Лошыцкая сядзіба» – філіяла ДУ «Музей гісторыі горада Мінска». У свой час сядзіба была цэнтрам культурнага жыцця ваколіц Мінска і прываблівала шматлікіх гасцей сваімі баламі і салонамі. У крыніцах па гісторыі сядзібы мы бачым згадкі аб музыкальных і літаратурных салонах, тэатральных мерапрыемствах і балах, якія давалі гаспадары сядзібы. Вынікам працы стала серыя балаў, якія далі магчымасць наведвальнікам музея пазнаёміцца з бальнай культурай сядзіб мяжы стагоддзяў, а таксама музычныя салоны, на якіх наведвальнікам музея была прадстаўлена музычная праграма з твораў кампазітараў XIX ст.

Адным з цікавых прыкладаў рэканструкцыі паўсядзённасці шляхам культурна-адукацыйнай дзейнасці сталі выставы свецкага касцюма. З'яўляючыся адным з найяскравейшых складнікаў матэрыяльнай культуры, свецкі касцюм уяўляе цікавасць у справе музеефікацыі паўсядзённасці. Улічваючы абмежаванасць у колькасці аўтэнтычных прадметаў эпохі, важнае значэнне атрымалі рэканструкцыі, створаныя з адпаведных матэрыялаў і ў традыцыях свайго часу.

Сярод студый і творчых майстэрняў, якія займаюцца гістарычнай рэканструкцыяй, асаблівай увагі заслугоўвае творчая суполка «Куфэрак», якая плённа супрацоўнічае з Музеем гісторыі горада Мінска на працягу апошніх чатырох гадоў. Вынікам супрацоўніцтва сталі дзве выставы свецкага касцюма XIX ст., якія адбыліся ў чэрвені–верасні 2014 г. і верасні–лістападзе 2015 г. у сядзібным доме Лошыцкага маёнтка.

З этыкетам перыяду знаёміць лекцыйная праграма, распрацаваная для навучэнцаў школ, студэнтаў і дарослых з улікам іх культурна-гістарычных ведаў. Так, слухачы лекцый могуць даведацца аб традыцыях выкарыстання веераў, правілах вітання і развітання і іншых аспектах этыкету мяжы стагоддзяў.

Культурна-адукацыйная дзейнасць музея мае надзвычайны педагагічны эфект. Яна дазваляе не толькі атрымаць новыя веды, але падсумаваць і структураваць назапашаны раней куль-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

турна-гістарычны вопыт, што прыводзіць да больш глыбокага вывучэння спадчыны мінулага. У той жа час уключэнне культурна-адукацыйных мерапрыемстваў у дзейнасць музея ўплывае на эфектыўнасць ўспрыняцця інфармацыі наведвальнікамі і з'яўляецца каштоўным унёскам у культурны адпачынак.


1. *Зайцева, Т. А.* Повседневность как исследовательское направление / Т. А. Зайцева // Вестник Томского государственного университета. Культурология и искусствоведение. – Томск, 2013. – № 2(10). – С. 5–11.

2. Культурно-образовательная деятельность музеев [Электронный ресурс] // Российская музейная энциклопедия. – М., 2016. – Режим доступа : http://www.museum.ru/rme/mb_cult.asp. – Дата доступа : 23.03.2018.

3. *Макеева, И. А.* Культурно-образовательная деятельность музея: содержание и формы / И. А. Макеева // Вестник КГУ им. Н. А. Некрасова. – Кострома, 2011. – Т. 17. – С. 164–168.

4. *Милешина, Н. А.* История повседневности как научное направление / Н. А. Милешина, А. В. Меркушин // Исторические, философские, политические и юридические науки, культурология и искусствоведение. Вопросы теории и практики : науч.-теорет. и прикладной журнал. – Тамбов, 2015. – № 11. – Ч. 3. – С. 103–105.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## «МУЖ БЛАГОВЕРНЫЙ, ЦЕРКВИ И ЦАРСТВУ ПОТРЕБНЫЙ…»


***Л. Н. Сидорович,***
*доктор искусствоведения, доцент,*
*заведующий кафедрой межкультурной коммуникации*
*Института современных знаний имени А. М. Широкова*


Русская художественная культура богата и многообразна. Она имеет древнейшие истоки и представлена целым рядом гениальных имен и известных вплоть до настоящего времени персоналий. Среди них по праву можно назвать и белорусско-русского деятеля духовной культуры XVII в., поэта, писателя, драматурга, проповедника, педагога, просветителя-гуманиста Симеона Полоцкого.

В историю белорусской и русской культуры XVII в. Симеон Полоцкий вошел не только как талантливый поэт, писатель, драматург, но и как известный религиозный деятель и выдающийся проповедник. Им созданы сборники проповедей «Обед